## *Бібліяграфія*

Нацыянальная школа Беларусі

Штомесячны бюлетэнь “Новыя кнігі: Па старонках беларускага друку”, які выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі з 1960 г., змясціў у дзевятым нумары за 2001 год бібліяграфічны спіс “Нацыянальная школа Беларусі”, падрыхтаваны Рэспубліканскай навукова-педагагічнай бібліятэкай Беларусі (складальнікі А.Дз.Кухарава і Л.Б.Яхімовіч).

Спіс ахоплівае літаратуру (кнігі, артыкулы) за апошнія пяць гадоў па акрэсленай тэматыцы. Літаратура ў ім сістэматызавана па асноўных тэматычных раздзелах, унутры раздзелаў — у лагічнай паслядоўнасці.

Анатаваны спіс складаецца з наступных раздзелаў: “Ідэя нацыянальнай школы ў гісторыі педагагічнай думкі і асветы Беларусі”, “Прававая аснова рэфармавання адукацыйнай сістэмы”, “Асноўныя фактары фарміравання нацыянальнай школы Беларусі”, “Народная педагогіка: вопыт і перспектывы выкарыстання”, “Фарміраванне сістэмы выхавання”, “Навучальныя ўстановы новага тыпу”, “Авалоданне культурнай спадчынай”. Апошні раздзел складаецца з падраздзелаў: “Выкладчыку беларускай мовы”, “Выкладчыку беларускай літаратуры”, “Выкладчыку гісторыі Беларусі”.
Матэрыялы, прадстаўленыя ў бібліяграфічным спісе, дапамогуць настаўнікам-практыкам у іх працы і паглыбленні ведаў па вышэйназваных тэмах. Вялікую цікавасць для педагагічных работнікаў уяўляе літаратура, у якой разглядаюцца асноўныя шляхі распрацоўкі новай выхаваўчай сістэмы: новае педагагічнае мысленне, накіраванасць і паступовасць у выхаванні, абарона правоў дзіцяці, развіццё сямейнай і народнай педагогікі, дзіцячых і маладзёжных аб'яднанняў, выхаванне на аснове ўзаемасувязі нацыянальнай культуры і агульначалавечых каштоўнасцей, распаўсюджванне новых формаў, напаўненне іх новым зместам.

***К.Дз.Варанько,***
*галоўны бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*